**СРОДКІ АКТУАЛЬНАГА ЧЛЯНЕННЯ І АКТУАЛІЗАЦЫІ** – разнастайныя адзінкі розных узроўняў моўнай сістэмы, якія выкарыстоўваюцца для афармлення выказвання.

**Актуалізацыя** – змяненне нарматыўнай структуры выказвання пад уздзеяннем камунікацыйнага задання.

Актуальнае члянeнне ўяўляе самастойны ўзровень моўнай сістэмы. Адзінкай гэтага ўзроўню з'яўляецца **выказванне** (гл**. ВЫКАЗВАННЕ**). Як і любая моўная адзінка, яно мае граматычныя сродкі афармлення, сярод якіх вылучаюць:

**асноўныя:**

1) ***інтанацыя*** – рытміка-меладычны аспект маўлення, які служыць у сказе сродкам выражэння сінтаксічных значэнняў і эмацыянальна-экспрэсіўных адценняў выказвання; тэма, размешчаная ў пачатку сказа, выдзяляецца павышэннем тону; паказчыкам рэмы служыць фразавы націск; на мяжы тэмы і рэмы інтанацыя змяняецца (такое змяненне суправаджаецца, як правіла, паўзай): *З таго ранняга марозу і снегу / толькі сталася гразь* (А. Жук) (гл. **ІНТАНАЦЫЯ**);

2) ***парадак слоў*** – узаемнае размяшчэнне кампанентаў сказа з мэтай стварэння цэласнага ў сэнсавых, сінтаксічных і стылістычных адносінах адзінства (гл. **ПАРАДАК СЛОЎ**):

   а) прамы парадак слоў адлюстроўвае найбольш характэрнае для пэўнага тыпу сказаў размяшчэнне ўзаемна звязаных кампанентаў. Напрыклад, у апавядальных сказах дзейнік стаіць перад выказнікам, дапасаванае азначэнне перад паяснёным словам і інш.: *Снег і вада паспелі скаціцца / не толькі з гарадскіх вуліц, двароў і паркаў, але і з прыгарадных падлескаў* (В. Карамазаў); *Я хачу правесці вас / па маёй зямлі* (У. Караткевіч);

   б) адваротны парадак слоў (інверсія) характарызуецца парушэннем звычайнага размяшчэння кампанентаў сказа, у выніку чаго пэўнае слова сэнсава і інтанацыйна вылучаецца: *Пра Галубка і яго тэатр / гаварыла ўся Беларусь* (С. Грахоўскі); *Першая яшчэ з сярэдзіны лета / скідала ліст бяроза* (І. Навуменка);

**дадатковыя:**

***часціцы*** – вылучаючы тэму або рэму, часціцы служаць для выражэння адзіна магчымага варыянта актуальнага члянення: *У разарыі красавалася / нават чорная руса, асаблівы гонар гаспадара* (А. Лойка); *Дагэтуль віяланчэль Аня бачыла / толькі па тэлевізары і ў музычнай школе…* (В. Гігевіч); *Супакоіўся ён* [*Сяргей*] */ ужо ў лесе* (М. Стральцоў).

Сродкамі актуалізацыі інфармацыйнай значнасці пэўных кампанентаў выказвання могуць быць:

**далучэнне** – спецыфічная сінтаксічная з'ява, якая выяўляецца ў прыбаўленні да асноўнага выказвання пры дапамозе далучальнай сувязі дадатковых звестак, тлумачэнняў, якія ўзнікаюць не адначасова з асноўнай думкай, а пасля яе: *Прачынаюся, на сэрцы горыч ад цяжкага сну, ад успамінаў. І цеплыня: жыве ўва мне і са мною мама* (А. Жук); *Усе згадзіліся, што месца добрае, зручнае: спераду вялікая прастора, далёка відаць, а за валунамі яны, як за каменнай сцяной. Ды яшчэ на ўзвышшы* (У. Дамашэвіч);

**няпоўныя сказы**: *Першая лыжка / за маміну ласку, Другая / − за татавы гушканні-гулі, Трэцяя / − за бабуліны казкі, Чацвёртая / − за жалейку дзядулі, Пятая / − за пеўніка чубатага, Шостая / − за коціка-дуроніка, Сёмая / − за жаўрука над хатаю, А восьмая / − за наша сонца-сонейка, Дзявятая / − за веснавую раніцу…* (М. Танк) (гл. **НЯПОЎНЫ СКАЗ**);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**назоўны ўяўлення (тэмы):** *Дарогі, дарогі, дарогі… Колькі вас, брукаваных і шасейных, гравейных і селавых, насыпаных і мокрых, гацевых, прайшлі людзі за гэты час разам з табуном!* (Я. Сіпакоў) (гл. **НАЗОЎНЫ ЎЯЎЛЕННЯ (ТЭМЫ);**
**устаўныя канструкцыі**: *І толькі школа (я адразу ўбачыў яе і беспамылкова пазнаў) стаяла ўбаку, за гародамі, бліжэй да лесу* (І. Шамякін) (гл. **УСТАЎНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ);**
**парцэляцыя**: *Цяпер у нашай вёсцы клуб. Не лепшы і не горшы, як у іншых вёсках наваколля* (Я. Брыль) (гл. **ПАРЦЭЛЯЦЫЯ)**.

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ